Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа №15 г. Мазыра імя генерала Барадунова Я.С.”

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ “ВЫКАРЫСТАННЕ АКТЫЎНЫХ ПРЫЁМАЎ ЯК СРОДАК РЭАЛІЗАЦЫІ ВЫХАВАЎЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НА ДРУГОЙ СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ”

Мішкова Аляксандра Віктараўна,

настаўнік беларускай мовы і літаратуры

8 (029) 147-52-59

e-mail: amishkova@list.ru

## 1. Інфармацыйны блок

**1.1. Назва тэмы вопыту**

Выкарыстанне актыўных прыёмаў як сродак рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучняў на ўроках беларускай мовы на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**1.2. Актуальнасць вопыту**

Выхаванне моладзі з'яўляецца прыярытэтнай задачай сучаснай адукацыі ў нашай краіне. Адукацыйным стандартам агульнай сярэдняй адукацыі вызначана асноўная мэта сярэдняй адукацыі – развіццё асобы навучэнца як носьбіта каштоўнасцей нацыянальнай культуры, які з павагай ставіцца да каштоўнасцей сусветнай культуры; патрыёта і актыўнага грамадзяніна, які валодае дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь; яго духоўна-маральным вопытам, гатовы да прафесійнага самавызначэння і непрэрыўнай адукацыі, магчымасці да самастойнага мэтавызначэння і жыццёвага выбару; каштоўнасных адносін да акаляючага асяроддзя і неабходнасці весці здаровы лад жыцця [1, с. 7-9].

З мэтай рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета “Беларуская мова” ў 2025/2026 навучальным годзе Міністэрства Адукацыі Рэспублікі Беларусь рэкамендуе выкарыстоўваць актыўныя метады і формы навучання: напрыклад, арганізацыя гутарак, публічных выступленняў, стварэнне тэкстаў пэўнага стылю і жанру і інш.[2, с. 12-16].

У Канцэпцыі непрырыўнага выхавання дзяцей і моладзі выхаванне вызначана як мэтанакіраваны працэс фарміравання духоўна-маральнай і эмацыянальна-асобаснай сферы навучэнца. Прызначэнне скіравана на паспяховую сацыялізацыю асобы ў сучасным грамадстве, падрыхтоўцы да самастойнага жыцця, прадуктыўнай працоўнай і прафесійнай дзейнасці; садзейнічае самаразвіццю, самавыхаванню, самаадукацыі, канкурэнтназдольнасці асобы, якая гатовая да прыняцця адказных рашэнняў [3, с. 1]. Тут жа даецца тлумачэнне паняцця “выхаванасці” як інтэгратыўнай асобаснай характарыстыкі, якая ўяўляе сабой сістэму поглядаў, каштоўнасцей,

асобасных якасцей і норм паводзін чалавека, вызначаючы яго адносіны да сябе, іншых, маралі, прадметам і з'явам акаляючага свету.

Для вызначэння ўзроўню сфарміраванасці выхаванасці вучняў правяла дыягностыку па методыцы Н.П.Капусцінай вучняў 5 "А" класа. Вынікі сведчылі пра тое, што з 28 вучняў толькі 7 (25%) мелі высокі ўзровень выхаванасці, на добрым узроўню выхавансць сфарміравана ў 8 вучняў (28,5%), сярэдні ўзровень мелі 6 вучняў (21,4%) і нізкі ўзровень выхаванасці мелі 8 чалавек, што складае 28,5%. Гэтыя вынікі дазволілі мне вызначыць праблемныя бакі і мэтанакіравана сфармуляваць мэту вопыту.

### 1.3. Мэта вопыту

Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу ў вучняў праз выкарыстанне актыўных прыёмаў на ўроках беларускай мовы на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

### 1.4. Задачы вопыту

- Прааналізаваць сфарміраванасць выхаванасці вучняў пры дыягностыцы;
- падабраць, распрацаваць, сістэматызаваць актыўныя прыёмы арганізацыі дзейнасці вучняў, якія садзейнічаюць рэалізацыі іх выхаваўчага патэнцыялу; прымяніць прыёмы на практыцы;
- абаснаваць выніковасць і эфектыўнасць выкарыстаных актыўных прыёмаў на ўроках беларускай мовы, якія накіраваны на рэалізацыю выхаваўчага патэнцыялу вучняў.

### 1.5. Працягласць працы над вопытам

Работа над вопытам пачалася ў 2020/2021 годзе і працягваецца да гэтага часу.

## 2. Апісанне тэхналогіі вопыту

### 2.1. Вядучая ідэя вопыту

Выкарыстанне актыўных прыёмаў на ўроках беларускай мовы садзейнічае рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучняў і будзе спрыяць

фарміраванню патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, павагі да гістарычнага мінулага, актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

**2.2. Апісанне сутнасці вопыту**

Пытанні выхавання вучняў падчас вучэбнай дзейнасці заўсёды цікавілі навукоўцаў і педагогаў. Яшчэ К.Д.Ушынскі слушна заўважаў, што выхаванне, пабудаванае ў адпаведнасці з інтарэсамі народа і заснаванае на народных традыцыях, развівае і ўмацоўвае ў дзяцей такія найкаштоўнейшыя псіхаланічныя рысы і маральныя якасці, як патрыятызм і нацыянальны гонар; раіў знаёміць дзяцей з гісторыяй свайго народа, з дасягненнямі матэрыяльнай і духоўнай культуры [4, с. 13-14]. Менавіта выхаванне з'яўляецца асноўным складнікам адукацыйнага працэсу. Разам з навучаннем яно павінна ісці адначасова і спрыяць цэласнаму развіццю асобы вучня. В.У. Зелянко звяртае ўвагу на тое, што навучанне мове прадугледжвае асэнсаванне вучнямі мовы як формы выражэння нацыянальнай культуры, спасціжэнне праз мову айчыннай культуры ў яе ўзаемадзеянні з культурамі іншых народаў [5, с. 3-4].

У метадычнай літаратуры знаходзім вызначэнне прыём – прыватны сродак рэалізацыі метаду, яго састаўны элемент, канкрэтныя дзеянні падпарадкаваныя агульнаму кірунку працы [6, с. 17], спосабы ўзаемазвязнай дзейнасці настаўніка і вучняў па ажыццяўленні задач навучання, выхавання, развіцця [6, с. 23].

Мною былі падабраны, распрацаваны, сістэматызаваны актыўныя прыёмы, накіраваныя на рэалізацыю выхаваўчага патэнцыялу вучняў на ўроках беларускай мовы, якія прадстаўлены ў табліцы.

| Этап урока | Клас | Прыёмы | Вынікі дзейнасці |
|---|---|---|---|
| Матывацыйна-арганізацыйны | 5 | "Дыялог з эпіграфам"<br><br>"І гэта добра" | Садзейнічае фарміраванню сапраўднага грамадзяніна, вучыць любіць родную мову, з павагай ставіцца да чужой мовы.<br>Вучыць не пасаваць перад цяжкасцямі, а бачыць у кожнай праблеме магчымасць для росту; захоўваць спакой і эмацыйную |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 6 | “Цікавая дата” | стабільнасць. Рэалізуюцца задачы духоўнага выхавання, фарміруюцца элементы этыкету, добрыя адносіны паміж аднакласнікамі |
| | 7 | “Інтэрв’ю”<br>“Камплімент”<br>“Лаві памылку” | Выхаванне культуры дыскусіі, самастойнасць, вучыць аргументаваць уласную пазіцыю. |
| | 8-9 | “Праблемнае пытанне”<br>“Пчаліны вулей” | Спрыяе фарміраванню грамадзянскай пазіцыі, агляд пытання “чалавек і закон”, а таксама пытанне ролі бацькоў у нашым жыцці. |
| Пазнавальна-аперацыйны | 5 | “Вучымся разважаць” | Садзейнічае развіццю самастойнасці ў пошуку інфармацыі, выхоўвае ў вучняў адказнасць, працавітасць, імкненне да дасягнення мэты. |
| | 6 | “Арфаграфічны трэнажор” | Выхоўвае любоў да Радзімы, гонар за свой горад, за подзвігі герояў вайны. |
| | 7 | “Словы для душы” | Выхоўваецца эстэтычны густ, узнікае цікавасць да спасціжэння прыгожага, гісторыі і культуры роднай зямлі. |
| | | “Праца з тэкстам”<br>“Ведаю.-Хачу даведацца.- Даведаўся.”<br>“Кошык ідэй” | Спрыяе фарміраванню чытацкай адукаванасці, экалагічнаму выхаванню,адбываецца выхаванне сапраўднага патрыёта. |
| | 8 | “Спытай у суседа”<br><br><br>“Гістарычная даведка” | Выхоўвае навыкі ўзаемадзеяння, актыўнасць, смеласць, выхоўвае даверлівыя адносіны паміж настаўнікам і вучнямі. |
| | 9 | “Мовазнавец”<br>“Эксперт” | Выхоўвае гонар за сваю краіну і яе знакамітых суайчыннікаў. |
| | | “Загадка для інтэлектуалаў”<br>“Воблака слоў” | Вучыць сур’ёзнаму стаўленню да справы, уменню весці дыялог і паважаць чужое меркаванне. |
| Дыягнастычна-карэкцыйны | 5 | “Завяршы фразу”<br>“Фразеалагізм у дарогу”<br>“Пазл” | Садзейнічае рэалізацыі працоўнага выхавання, фарміруе стаўленне з павагай да людзей, працаўнікоў зямлі. |
| | 6 | “Белыя плямы”<br>“Канструктар” | Выхоўваецца любоў да роднай мовы, навыкі этыкету. |
| | 7 | “Крытэрыі поспеху”<br>“Алфавіт” | Спрыяе выхаванню самастойнасці, адказнасці, дапамагае фарміраваць |
| | 8 | “Сінквейн” | самакантроль і самаацэнку ў вучня. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 9 | “Так ці не”<br><br>“Скарбонка пытанняў” | Стымуляванне рэфлексіі, эмпатыі і грамадзянскай пазіцыі.<br>Спрыяе фарміраванню ўласнай пазіцыі, вучыць ацэньваць учынкі з пункту гледжання маралі.<br>Вучыць прымаць рашэнні і несці адказнасць за іх, развівае самастойнасць. |
| Завяршальны | 5-9<br><br><br><br>8-9<br><br><br><br>5-7 | “Прыказка або прымаўка ў дарогу”<br><br><br><br>“Плюс-Мінус-Цікава”<br><br><br><br>“Я-мастак” | Вучацца самастойна аналізаваць сваю працу, свой эмацыйны стан на ўроку, а таксама дакранаюцца да народнай мудрасці.<br>Спрыяе фарміраванню бачыць канструктыўны бок сваёй працы,развівае адказнасць, дапытлівасць.<br>Дазваляе рэалізаваць задачы сямейнага выхавання. |

Пачатак урока – гэта момант, калі неабходна паўплываць на эмацыйную сферу вучня, заматываваць. Так, пры вывучэнні тэмы “Антонімы” ў 5 класе на матывацыйна-арганізацыйным этапе выкарыстоўваю прыём “Дыялог з эпіграфам”. Задаю вучням пытанне : “Колькі моў вывучаеце ў школе? З якой мовай сябруеце?”. Прашу павітацца на мовах, якія яны вывучаюць.Потым чытаю эпіграф: “Яно добра, а нават трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю” (Ф. Багушэвіч). Прапаную паразважаць над выразам “свая мова”, “чужая мова”. Пасля абмеркавання эпіграфа прашу выпісаць словы з супрацьлеглым значэннем. Так падводжу да тэмы ўрока. Гэты прыём універсальны, не мае ні ўзроставых, ні зместавых межаў. Безумоўна, тут выхоўваем сапраўднага грамадзяніна, вучым любіць родную мову, з павагай ставіцца да чужой мовы.

Пры вывучэнні новага матэрыялу выкарыстоўваю элементы даследчай дзейнасці. Гэта праца фарміруе дапытлівасць і актыўнасць. Так пры вывучэнні тэмы “Архаізмы (устарэлыя словы), неалагізмы (новыя словы)” у 5 класе выкарыстоўваю прыём “Вучымся разважаць”. Прапаную вучням прачытаць і выбраць патрэбнае.

I. Міхась кажа: “Гусар”.

II. Міхась кажа: “Інавацыя”.

Я кажу: “Гусляр”.
Бяром мы з нашай мовы
Патрэбныя нам словы.

Я кажу: “Акрэдытацыя”.
Бяром мы з нашай мовы
Патрэбныя нам словы.

Далей арганізую міні-даследаванне і працу са слоўнікамі. Вучні самастойна знаходзяць словы, іх лексічнае значэнне, а з рубрыкі “Для даведкі” бяруць цікавую інфармацыю пра гусляра і гусара; вынікі работы агучваюцца для класа. Такая праца дапамагае не толькі развіваць самастойнасць у пошуку інфармацыі, але і выхоўвае ў вучняў адказнасць, працавітасць, імкненне да дасягнення мэты.

На дыягнастычна-карэкцыйным этапе выкарыстоўваю прыём “Завяршы фразу” падчас вывучэння тэмы “Прамое і пераноснае значэнне слова” ў 5 класе прапаную вучням завяршыць сказ. Лёгкі хлеб –пра … (лёгкую, бестурботную працу). Надзённы хлеб – тое, … (што патрэбна для жыцця). Цяжкі хлеб – праца, … (якая патрабуе вялікіх намаганняў). Тут вяду гутарку пра ролю хлеба ў жыцці чалавека, пра ролю сейбіта і яго цяжкую працу. Такім чынам, рэалізую працоўнае выхаванне, стаўленне з павагай да людзей, працаўнікоў зямлі.

На завяршальным этапе выкарыстоўваю прыём  “Прыказка або прымаўка ў дарогу”. Для гэтага вучні павінны выбраць прыказкі і прымаўкі, якія характарызуюць працу на ўроку і пракаменціраваць. “Праца цяжкая, але хлеб ад яе салодкі”, “Шчырая праца-мазалёвая”, “Работа і корміць, і поіць” і іншыя. Падчас такой працы вучні не толькі самастойна аналізуюць сваю працу, свой эмацыйны стан на ўроку, а таксама дакранаюцца да народнай мудрасці.

Творчыя здольнасці вучняў выхоўваю пры дамапозе творчых дамашніх заданняў. Тут выкарыстоўваю прыём “Я–мастак”. Напрыклад, для вучняў 5 класа прапаную аформіць мастацкую выставу або намаляваць карціны да тэкста пэўнай тэмы. Часта вучні выконваюць заданні разам з бацькамі, што дазваляе рэалізаваць сямейнае выхаванне.

Пачынаючы з 6 класа на матывацыйна-арганізацыйным этапе выкарыстоўваю прыём “Каляндар цікавых дат”. Пішу на дошцы дату ўрока, размяшчаю ілюстрацыю і  абавязкова задаю пытанне вучням:  “Чым значным вызначаецца сенняшняя дата?”, “Што адбылося…?” . Прашу суаднесці падзею і

ілюстрацыю. Напрыклад, 14 кастрычніка адзначаецца Дзень маці, прымеркаваны да вялікага праваслаўнага свята – Пакровы Прасвятой Багародзіцы. Вяду гутарку з вучнямі пра іх маці, цікаўлюся, якія віншаванні прыгатавалі яны на гэтае свята. Такім чынам, рэалізуецца сямейнае выхаванне. Потым звяртаю ўвагу на слова "пакроў", як яго падае праваслаўная царква. Акцэнтую ўвагу на тым, што гэтае свята вельмі важна для хрысціян. Так рэалізую задачы духоўнага выхавання. Вучні прызвычайваюцца да гэтай работы і ў старэйшых класах самі рыхтуюць цікавую інфармацыю, каб папоўніць наш каляндар. Таксама на гэтым этапе выкарыстоўваю прыём "Камплімент", "Інтэрв'ю", "Праблемнае пытанне".

Пры вывучэнні тэмы "Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс назоўнікаў" у 6 класе на пазнавальна-аперацыйным этапе выкарыстоўваю прыём "Арфаграфічны трэнажор". Для гэтага дэманструю прэзентацыю "Падарожжа па Мазыры". Звяртаю ўвагу вучняў на подпіс слайдаў: плошча Леніна, кінатэатр Мір, вуліцы Вікенцьева, Ц. Абрамава, Г. Ціханава. Гэта дае падставу выхоўваць любоў да Радзімы, ганарыцца сваім горадам.

На фізкультхвілінках практыкую прыём "Словы для душы". Звычайна выбіраю ўрыўкі з твораў беларускіх пісьменнікаў або фрагменты музычных кампазіцый вядомых беларускіх ансамбляў "Верасы", "Песняры", "Сябры".

А ў маёй Беларусі
Столькі сіняга неба,
Столькі светлага сонца
І духмянага хлеба!

Вольна дыхаюць грудзі,
Сонца ласкава свеціць,
І мілей Беларусі
Мне няма ва ўсім свеце!

М.Зяленка

Пасля выканання фізкультхвілінкі прашу падабраць словы-асацыяцыі, перадаць пачуцці, думкі, разважанні. Такім чынам выхоўваецца эстэтычны густ на творах беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў, узнікае цікавасць да спасціжэння прыгожага, гісторыі і культуры роднай зямлі.

На этапе замацавання набытых ведаў выкарыстоўваю прыём "Белыя плямы", "Канструктар", "Завяршы фразу". Так, пры вывучэнні тэмы "Якасныя,

адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні” ў 6 класе прапаную аднавіць радкі верша, ужываючы прыметнікі ў патрэбным родзе, ліку, склоне, запоўніць “белыя плямы”.

У любімай мове,….,….,
Ах, якія словы, “………..!”
Як звіняць яны ….. струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною

П.Броўка

Праводжу гутарку па тэме “Ветлівыя словы”, вучні ўзгадваюць, у якіх сітуацыях мы карыстаемся словамі, будуюць дыялогі. На гэтым этапе ідзе не толькі развіцце маўлення вучняў, але і выхоўваецца любоў да роднай мовы, навыкі этыкету.

Пачынаючы з 7 класа на этапе вывучэння новага матэрыялу прымяняю прыём “Праца з тэкстам”. Пры вывучэнні тэмы “Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі” бяру адзін з тэкстаў падборкі “Цуды Беларусі”. Далей уводжу прыём “Ведаў.-Хачу даведацца.-Даведаўся”. Вучням неабходна запоўніць табліцу.

| Ведаю | Хачу даведацца | Даведаўся |
|---|---|---|
| | | |

Гэты прыём не толькі прадугледжвае працу з тэкстам, але і рэалізоўвае задачы экалагічнага выхавання, выхоўвае сапраўднага патрыёта.

На завяршальным этапе выкарыстоўваю прыёмы “Алфавіт”, “Сінквейн”, “Плюс-Мінус-Цікава”, “Скарбонка пытанняў”, а таксама “Крытэрыі поспеху”. Так пры вывучэнні ў 7 класе вялікага раздзела “Дзеяслоў” прапаную вучням крытэрыі поспеху: канкрэтныя паказчыкі, па якіх вучань разумее, што ён засвоіў тэму. Напрыклад, тэма: “Дзеяслоў як часціна мовы: трыванне дзеяслова”. Крытэрыі поспеху( Я магу…): дакладна сфармуляваць пытанні да дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання; знайсці дзеясловы ў тэксце і вызначыць іх трыванне; утварыць суадносныя пары дзеясловаў; правільна выкарыстоўваць пары дзеясловаў у звязным маўленні.Такая работа спрыяе

выхаванню самастойнасці, адказнасці, дапамагае фарміраваць самакантроль і самаацэнку ў вучня.

Рэалізацыі выхаваўчых задач урока на этапе актуалізацыі апорных ведаў спрыяе выкарыстанне прыёма “Кошык ідэй”. Так пры паўтарэнні тэмы “Стылі маўлення” ў 8 класе прашу вучняў запісаць на картах усе, што яны ведаюць па гэтай тэме. Працуючы ў парах, вучні высвятляюць: ці супалі іх адказы, выказваюць свае думкі, якія фіксуюцца ў кошыку. Пры абмеркаванні не крытыкую і не ацэньваю вучняў, для таго, каб слабы вучань спрабаваў выказаць свае думкі. Такі прыём выхоўвае навыкі ўзаемадзеяння, актыўнасць, смеласць, выхоўвае даверлівыя адносіны паміж настаўнікам і вучнямі.Таксама можна выкарыстоўваць прыём “Пазл”, “Спытай у суседа”.

На пазнавальна-аперацыйным этапе у 8 класе выкарыстоўваю прыём “Гістарычная даведка”, дзе вучні самастойна падаюць інфармацыю пра знакамітых навукоўцаў, мовазнаўцаў, педагогаў. Пры вывучэнні тэмы “Віды падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні : дапасаванне, кіраванне, прымыканне”спачатку вызначаю асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове , потым пераходжу да працы з адметнымі беларускімі словазлучэннямі “спарыць малака”, “гатаваная вада” на аснове тэкста А.Клышкі. Потым вучань агучвае гістарычную даведку пра заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь, аўтара беларускага “Буквара” А.К.Клышку. Такім чынам, акцэнтую ўвагу на тым, якую вялікую працу зрабіў ён для навукі, адукацыі, грамадства. Гэта выхоўвае гонар за сваю краіну і яе суайчыннікаў.

Прыём “Праблемнае пытанне” часцей выкарыстоўваю на этапе мэтавызначэння ў 9 класе. Так пры вывучэнні тэмы “Паняцце пра складаназалежны сказ” бяру словы рымскага паэта Гарацыя: “Гаспадар на зямлі той, хто выконвае парады бацькоў, прытрымліваецца правіл і законаў”, выводжу на праблемнае пытанне, пасля прашу запісаць адказ складаназалежным сказам. Так рэалізую выхаванне грамадзянскай пазіцыі,

разбіраю пытанне “чалавек і закон”, а таксама звяртаюся да пытанняў ролі бацькоў у нашым жыцці.

Заўсёды практыкую моўнае суправаджэнне пры характарыстыцы адзнакі ці выканага практыкавання. Гэта дазваляе вучню прасачыць дынаміку вынікаў вучэбнай дзейнасці, а настаўніку – прааналізаваць магчымасці вучня і накіраваць яго на далейшую працу. Так выхоўваецца ўпэўненасць, актыўнасць, смеласць.

**2.3. Рэзультатыўнасць і эфектыўнасць вопыту**

Пра рэзультатыўнасць разгледзеных прыёмаў сведчыць параўнальная дыяграма ўзроўню выхаванасці вучняў абранага класа ў 2021/2022, 2023/2024, 2024/2025 гадах (Дадатак 2). Зыходзячы з аналізу, можна канстатаваць, што за вызначаны прамежак часу ўзрос паказчык высокага і добрага ўзроўню выхаванасці вучняў 9 класа ў параўнанні з 5 класам: высокі ўзровень – 10вучняў ( 35,7%), добры – 8 вучняў (28,5%), а таксама знізіўся паказчык нізкага ўзроўню ўдвая (на 14,5 %). Раблю выснову, што выкарыстанне апрабаваных прыёмаў спрыяла павышэнню ўзроўня выхаванасці вучняў.

**3. Заключэнне**

У выніку сістэматызацыі педагагічнага вопыту прыйшла да высновы, што выхаванне - гэта не спецыяльны этап, не “выхаваўчы момант”, а мэтанакіраванае стварэнне на ўроку арганізацыйных, псіхолага-педагагічных умоў для выхавання вучняў, якія спрыяюць фарміраванню ў іх сацыяльна-значнай сістэмы каштоўнасцей і ідэалаў. Склалася сістэма работы, якая дазволіла мне мэтанакіравана вызначаць праблемы, якія ўзнікаюць пры рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрока, знаходзіць эфектыўныя прыёмы рашэння гэтых праблем, а таксама рэалізоўваць прыярытэтную задачу адукацыі -выхаванне вучняў на ўроку.

У выніку працы над тэмай вопыту былі апрабіраваны прыёмы, якія можна выкарыстоўваць на розных этапах урока беларускай мовы для рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Прадстаўлены вопыт універсальны, можа быць выкарыстаны ў практыцы іншых настаўнікаў. Ён карысны як для пачынаючых, так і для вопытных педагогаў. Матэрыялы вопыту былі выкарыстаны на пасяджэнні школьнага вучэбна-метадычнага аб’яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, а таксама на педагагічным савеце. Неаднаразова праводзіліся адкрытыя вучэбныя заняткі з дэманстрацыяй сістэмы выкарыстання розных прыёмаў як сродку рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу на ўроках беларускай мовы.

Планую працягнуць працу над дадзенай тэмай у межах пашырэння і паглыблення прыёмаў, якія будуць рэалізоўваць выхаваўчы патэнцыял вучняў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Спіс выкарастаных крыніц**


1. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [сайт]. – Мн., 2003-2025.- URL: http://www.pravo.by (дата обращения: 28.11.2025).
2. Национальный образовательный портал [сайт]. - Мн., 2003-2025.- URL: http://www.adu.by (дата обращения: 28.11.2025).
3. Национальный образовательный портал [сайт]. - Мн., 2003-2025.- URL: http://www.adu.by (дата обращения: 28.11.2025).
4. Дубініна, Д.М., Дубінін, Д.У. Краязнаўчыя экскурсіі як сродак патрыятычнага выхавання дзяцей ва ўзросце ад 6 да 7 гадоў / Д.М. Дубініна, Д.У. Дубінін // Веснік адукацыі. – 2025. - №10. – С. 13-19.
5. Зелянко, В. У. Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10-11 классы / В.У. Зелянко. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2011. – 136 с.
6. Ляшчынская, В.А. Методыка выкладання беларускай мовы: Задачы і практыкаванні / В.А. Ляшчынская. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 191 с.

**Дадатак 1**

**Тэхналагічная карта ўрока па беларускай мове ў 8 класе**

**Тэма**: Тэкст і яго асноўныя прыметы(паглыбленае паўтарэнне). Паглыбленне паняцця пра паслядоўную і паралельную сувязь сказаў у тэксце.

**Тып урока**: урок камбінаванай будовы.

**Мэта ўрока**: плануецца, што да канца ўрока вучні ўзгадаюць і паглыбяць паняцце пра тэкст і яго асноўныя прыметы; пашыраць звесткі пра паслядоўную і паралельную сувязь сказаў у тэксце.

**Задачы ўрока**:

- спрыяць узнаўленню і паглыбленню паняцця пра тэкст і яго лінгвістычныя асаблівасці;

- выпрацоўваць уменне ўспрымаць тэкст як цэласнае выказванне, аб’яднанае тэмай, сэнсам і граматычна;

- садзейнічаць паглыбленню паняцця пра паслядоўную і паралельную сувязь сказаў у тэксце, пра сродкі сувязі частак і сказаў;удасканальваць уменне будаваць сказы;

- стварыць умовы для фарміравання ў вучняў павагі да нацыянальнай прыналежнасці.

**Абсталяванне:** Бадзевіч З.І., Саматыя І.М.Беларуская мова: вучэбн. дапам. для 8 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання/ Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020.

## Ход урока

| Назва этапа, задачы этапа | Змест | Прыёмы | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|---|---|---|
| **1. Матывацыйна-арганізацыйны этап.**<br>**Задача этапа:**<br>-стварыць умовы для знешняй і ўнутранай (псіхалагічнай) падрыхтаванасці класа да ўрока, арганізаваць увагу вучняў;<br>-спрыяць фарміраванню ўмення вучняў ставіць задачы на ўрок. | Працэс вітання вучняў і настаўніка, арганізацыя ўвагі вучняў, паведамленне тэмы, мэты ўрока, фарміраванне задач на ўрок. | “І гэта добра”<br><br>“Дыялог з эпіграфам” | (Настаўнік вітае вучняў, ацэньвае падрыхтаванасць да ўрока. Адзначае адсутных, пытаецца ці ведаюць вучні пра стан здароўя свайго аднакласніка, які хварэе, ці наведвалі яго?Агучвае тэму ўрока, просіць паставіць вучняў задачы на ўрок.)<br>- Добры дзень! Я вельмі рада вас усіх бачыць.<br>(Зычу ўсім плённай працы.)<br>Край з калыскі любімы,<br>Каля сцежкі чабор,<br>Жар асенняй рабіны<br>У блакіце азёр,<br>Бор палае на ветры<br>У сузор'і зарніц...<br>Як жа край гэты светлы<br>Нам з табой не любіць?<br>У.Карызна<br>- Дзе б мы ні былі, якую б экзатычную прыроду ні бачылі, нас заўсёды цягне да нашых лясоў, да нашых лугоў. Чым жа так прываблівае беларуская зямля?<br>Ці можам мы сказаць, што гэтыя радкі ўтвараюць тэкст? Чаму?<br>-А зараз давайце звернемся да тэмы | Вучні вітаюць настаўніка, далучаюцца да гутаркі.<br><br>Зачытваюць эпіграф, аналізуюць яго. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | ўрока і паспрабуем сфармуляваць задачы.<br>Прапануе зрабіць запіс даты і тэмы ўрока ў сшытак. | Запісваюць дату, тэму ўрока. |
| **2. Пазнавальна-аперацыйны этап.**<br>**Задача этапа:**<br>-скласці ўмовы для комплекснага ўзнаўлення і прымянення ведаў, уменняў і навыкаў па тэме “Тэкст”;<br>-праверыць замацаванне матэрыялу па тэме роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры. | Праверка дамашняга задання §1, пр. 6 (прачытаць тэкст, вызначыць яго асноўную думку).<br>Індывідуальнае заданне-паведамленне пра беларускія традыцыі. | “Мовазнавец” | (Правярае дамашняе заданне разам з вучнямі.) | Адзін вучань зачытвае тэкст, вызначае асноўную думку.<br>Другі расказвае пра беларускія традыцыі.<br>Трэці працуе з тлумачальным слоўнікам беларускай мовы (артыкул да слова “пыхлівы”). |
| | Актуалізацыя вопыту вучняў па тэме тэкст. | | Узнаўляльная гутарка па пытаннях:<br>- Што называецца тэкстам?<br>- Якую рролю ў тэксце выконвае загаловак? Што ён можа выражаць?<br>- Якія пытанні трэба задаць, каб вызначыць асноўную думку тэксту? Тэму тэксту?<br>- Якія сродкі сувязі паміж сказамі існуюць ў тэксце?<br>- Чым адрозніваецца тып тэксту апісанне ад апавядання і разважання?<br>Прапануе чытаць правіла ў падручніку | Адказваюць на пытанні.<br>Чытаюць правіла. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Стварэнне ўмоў для ўзнаўлення і прымянення ведаў па тэме тэкст на практыцы<br>Устанаўленне ступені засваення матэрыялу | “Белыя плямы”<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>“Воблака слоў” | стар.10-11.<br>Прапануе працу ў групах:<br>***1 група*** запаўніць тэкст з прапушчанай інфармацыяй “Якія прыметы мае тэкст?”<br>*Тэкст характарызуецца наступнымі прыметамі: сэнсавай цэласнасцю, тэматычным адзінствам, звязнасцю, разгорнутасцю, паслядоўнасцю і ….*<br>*Сэнсавая цэласнасць выяўляецца ў тэксце тады, калі сказы звязаны …. … праяўляецца ў тым,што ўсе сказы падпарадкаваны раскрыццю тэмы і асноўнай думкі.*<br>*Разгорнутасць сведчыць пра тое, што… адбываецца з дапамогай падтэм.*<br>*Паслядоўнасць рэалізуецца праз тое, што кампаненты зместу размяшчаюцца ў …, а гэта стварае … тэксту.*<br>***2 група*** Складзі воблака слоў па тэме “Тэкст”.<br>***3група*** Пастаўце сказы ў пэўнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. Дакажаце, што гэта тэкст (згодна з прыметамі тэксту).<br>*1. Бо ўсе мы на гэтай зямлі суседзі-рэчка і бусел, дрэва і травінка, кветка і пчала, мураш і чалавек. 2. Мы часам забываемся, што прырода не для нас адных… 3. Бо зямля ў нас адна, яна агульная для ўсіх. 4. Усе мы зямляне. 5. І* | Праца ў групах. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | *ўсе мы маем радасць суіснаваць на ёй, жыць у сапраўднай дружбе і ўзаемнай павазе.* | |
| **Фізкультхвілінка** (на 20-й хвіліне ўрока).<br>**Задача этапа:**<br>-зняць стомленасць вучняў, павысіць іх працаздольнасць. | Выкананне рухаў пад музыку. | “Словы для душы” | Прапануе паслухаць кампазіцыю Алеся Ставера “Жураўлі на Палессе ляцяць” у выкананні ансамбля “Песняры”.Выканаць фізічныя рухі пад музыку | Вучні слухаюць музыку, выконваюць рухі. |
| | | “Эксперт”<br><br>“Мовазнавец” | (Прапануе адзначыць характарыстыкі, якія адпавядаюць наступным тэкстам.)<br>***1 група.***<br>*Па высокай траве паважна і маўкліва ходзіць бусел. У яго вострая і моцная дзюба чырвонага колеру, доўгія ногі таксама чырвоныя. Сам ён белы. Чорныя толькі канцы вялікіх і шырокіх крылаў. Бусел не мае голасу. Ён не крычыць, а клякоча – гучна і часта шчоўкае дзюбай. Гняздзіцца бусел недалёка ад чалавека. Кожную вясну вяртаецца на сваё старое месца, дзе знаходзіцца яго буслянка. Гняздо ў бусла вялікае. Яно складзена з галля. Кожны год буслы дабудоўваюць сваё жыллё, і буслянка робіцца ўсё большай і вышэйшай. Унутры яна выслана травой, саломай, пер’ем. У красавіку бусліха адкладвае некалькі яек. Малыя бусляняты з’яўляюцца ў маі, а восенню* | Праца ў групах.<br>Адзін вучань працуе са слоўнікам (артыкул “бусел” і “журавель”).<br>Тры вучні складаюць тэксты: па пачатку, па асноўнай частцы, па заключнай частцы.<br>*1. У гэтым годзе мне спаўняецца 14 гадоў і я атрымаю падарунак-кнігу “Я грамадзянін Рэспублікі Беларусь”… .*<br>*2. … Беларусь мяжуе з Расіяй,* |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | *яны разам з бацькамі адлятаюць у вырай.*<br>1. Тып тэксту-апісанне;<br>2. Тэкст адказвае на агульнае пытанне-*якая асоба*?<br>3. Сувязь сказаў у тэксце-паралельная;<br>4. Асноўная думка выражанаў 4 сказе;<br>5. Адным са сродкаў сувязі сказаў з’яўляецца прыслоўе<br>***2 група.***<br>*А ці ведаеш ты, мой дружа, адкуль з'явіліся на нашай зямлі буслы і чаму яны любяць жыць па вёсках, сярод людзей? Не чуў? Тады слухай. Калісьці вандраваў на белым свеце добры чараўнік. І заблукаў ён на Беларусь. Бачыць – прыгожая тут зямля. Векавыя пушчы, ураджайныя палеткі, не злічыць рэчак і азёраў... Адно кепска: развялося шмат розных паўзучых гадаў. Жыцця ад іх няма ні людзям, ні жывёліне. Паспачуваў дабрадзей нашым прашчурам. Узяў вялізную торбу і сабраў туды рознае плюгаўства. Вядома, стаміўся ад такой нялёгкай работы. Таму і гукнуў на падмогу хлопца, які сена касіў на лузе. Узваліў яму чараўнік торбу на спіну ды загадаў не развязваць па дарозе. А дзяцюк, як на тое, аказаўся вельмі цікаўны і развязаў торбу. Гады* | *Украінай, Польшчай, Латвіяй і Літвой ….*<br>3. ... *Я ганаруся сваёй краінай, тым, што я –беларус!* |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | *тым часам вылезлі і распаўзліся па ўсёй зямлі. Добры чараўнік не схацеў другі раз з імі пэцкацца. Начапіў ён парожнюю торбу неслуху-касцу на плячо – выправіў яго збіраць выпушчанае плюгаўства. Толькі дзяцюк злавіў першую жабу – як ператварыўся ў бусла. З таго часу і дыбае бусел, нібы касец, па лугах-балотах.*<br>1. Тып тэксту-апавяданне;<br>2. Тэкст адказвае на агульнае пытанне-чаму?<br>3. Сувязь сказаў у тэксце-паслядоўная;<br>4. Асноўная думка выражана ў 6 сказе;<br>5. Адным са сродкаў сувязі сказаў з’яўляецца займеннік.<br>***3 група.***<br>*Бусел для беларусаў — святая птушка. Забіць бусла — вялікі грэх. Па бусле варажылі, які будзе год: калі ён скіне з гнязда яйка — добры год, хлеба купіш за яйка, калі птушаня — благі, неўраджайны, хлеба не купіш і за дзіця, а яшчэ горш — нехта малады памрэ ў вёсцы. Дачыненні чалавека і бусла — прыклад гарманічнага суіснавання чалавека і дзікай прыроды, якая становіцца свойскай: чалавек дапамагаў буслу будаваць гняздо, ахвяруючы дзеля гэтага старыя колы, бароны, кладучы* | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | *туды кавалкі жалеза, медзі. За гэта бусел магічным чынам засцерагаў жыллё ад пажару.*<br>1. Тып тэксту-разважанне;<br>2. Тэкст адказвае на агульнае пытанне: што адбываецца з асобай?<br>3. Сувязь сказаў у тэксце-паслядоўная;<br>4. Асноўная думка выражана ў 1 сказе;<br>5. Адным са сродкаў сувязі сказаў з'яўляецца злучнік. | |
| **3.Дыягнастычна-карэкцыйны этап.**<br>**Задача этапа:**<br>-падвесці вынікі, выявіць узровень ведаў на канец урока, скласці ўмовы для самааналізу дзейнасці вучняў на канец урока. | Выяўленне ўзроўню набытых ведаў, уменняў, навыкаў па тэме, устанаўленне эмацыянальнага стану вучняў на канец урока. | "Фразеалагізм у дарогу" | Прапануе працу з фразеалагізмамі: патлумачыць значэнне, пасля выбраць фразеалагізм, які адпавядае стану працы ў групе на ўроку.<br>Адзін пры адным<br>Іграць другую скрыпку<br>Бібікі біць<br>Сесці ў лужыну | Тлумачаць значэнне фразеалагізма, выбіраюць фразеалагізм, які адлюстроўвае працу ў групе на ўроку. |
| **4. Завяршальны**<br>Задача:Выявіць разуменне вучнямі зместу дамашняга задання;выставіць і пракаменціраваць адзнакі | Паведамленне дамашняга задання, выстаўленне і каменціраванне адзнак | | Параграф 2, пр.16 (прачытаць тэкст, вызначыць прыметы; ахарактарызаваць спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак).<br>Адшукаць інфармацыю пра дзейнасць народнай мастачкі Алены Кіш (індывідуальнае).<br>Выставіць і пракаменціраваць адзнакі | Вучні запісваюць дамашняе заданне ў дзённік, задаюць пытанні пры наяўнасці.<br>Выстаўляюць адзнакі за работу на ўроку |

Дадатак 2


Узровень выхаванасці вучняў на працягу 2021-2026 гадоў
12
10
8
6
4
2
0
высокі ўзровень
добры ўзровень
сярэдні ўзровень
нізкі ўзровень
2021/2022
2023/2024
2025/2026